# Пісьменнік ідзе да чытача

**У мінулым нумары «НС» ужо пісала, што на пачатку лютага ў сталіцы рэспублікі прайшла XXVI Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш. У рамках мерыпрыемства адбылася прэзентацыя кнігі «Беларускі крымінальны вышук». У сённяшнім рэпартажы раскажам пра іншыя цікавыя падзеі**




Фота Альберта ЕРМАКОВА.

Адразу трэба сказаць пра сёлетнюю адметнасць і маштаб традыцыйнага ў асветніцкім жыцці нашай краіны форуму. Упершыню ў сваёй шматгадовай гісторыі ён працаваў цягам пяці дзён на розных пляцоўках. Напрыклад, у Палацы мастацтва дзякуючы галерэі Саюза дызайнераў Беларусі айчынныя майстры кніжнай графікі розных пакаленняў прадэманстравалі свае найлепшыя работы, якія маюць дачыненне да мастацкай кнігі. А ў краме «КнігаПоліс» адбылася творчая сустрэча з удзелам аднаго са складальнікаў серыі «Дзіцячы атлас Беларусі» Дзмітрыем Пятровічам. Паводле рэйтынгаў «Белкнігі» за мінулы год, гэтая серыя стала лідарам продажаў. У інтэрв'ю «Звяздзе» напярэдадні адкрыцця Міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч пагадзіўся, што той, хто робіць стаўку на дзіцячыя кнігі, не прайграе.

Вельмі добра, што падчас выстаўкі такім выданням было прысвечана шмат разнастайных мерапрыемстваў. Адно з іх - сустрэча ў той жа «КнігаПолісе» з паэтам, аўтарам новага выдання «Таямніца нашага садка» Васілём Дранько-Майсюком. Разам з ім да малога чытача шчыра ідуць патрыярх айчыннай дзіцячай літаратуры Уладзімір Ліпскі, Мікола Чарняўскі, Алена Стэльмах, Анатоль Зэкаў, Яна Явіч, Генадзь Аўласенка, Міхась Пазнякоў. У гэтай жа краме, дарэчы, ладзілася таксама прэзентацыя кнігі «Легенды і паданні Беларусі». У кнігарні «Вянок» з новым выданнем «Жаласлівая каралеўна» наведвальнікаў чакаў падчас сваёй аўтограф-сесіі пісьменнік Пятро Васючэнка.

Прэзідэнцкая бібліятэка Беларусі стала месцам размовы пра гісторыю Мірскага замка. У цэнтры ўвагі быў міжнародны праект, які ў гэтым годзе пачне рэалізоўвацца замкавым комплексам сумесна з рэгіянальнымі літоўскімі паркамі Павільняй і Веркяй. Акрамя таго, даследчыкі прадставілі калектыўную манаграфію «Князі Вітгенштэйны і іх уладанні ў Расійскай імперыі ў XIX стагоддзі». Названыя тытулаваныя асобы мелі велізарныя землі на тэрыторыях, дзе сёння пражываюць літоўцы, беларусы, расіяне і малдаване.

У самым пачатку ў павільёне «Белэкспа» панавала яе вялікасць паэзія. «Мастацкая літаратура» прэзентавала наведвальнікам серыю кніг «100 вершаў». У іх ліку - калектыўны зборнік «Зямля бацькоў, зямля святая», сабраныя творы Яўгеніі Янішчыц «Кахання сад і ластаўка вясны», Генадзя Бураўкіна «Ніці лёсу», Міхася Стральцова «Я зноўку тут» і Пімена Панчанкі «Сэрца маё», а таксама адметныя навінкі, сярод якіх перавыдадзены спецыяльна для выставы зборнік паэзіі Уолта Уітмена «Лісце травы». Больш за 200 гадоў таму, здзівіўшы смеласцю і наватарствам, ён кардынальна паўплываў на працэс станаўлення сусветнай літаратуры. На беларускую мову яго пераклаў лаўрэат Дзяржпрэміі БССР Янка Сіпакоў. Сваё другое жыццё пачаў з дапамогай той жа «Мастацкай літаратуры» добра вядомы некалі альманах «Далягляды». У ім знаходзім сёння як паэзію, так і прозу розных краін. Выдавецтва плануе выдаць вершы класіка кітайскай паэзіі мінулага стагоддзя Ай Ціна, іншых замежных літаратараў.

Шмат пазнавальнага прапанавала і «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». Перадусім - гэта трохтомная персанальная энцыклапедыя «Янка Купала», якую можна ўжо набыць у кнігарнях. Добрую падрыхтоўку да форуму прадэманстраваў Выдавецкі дом «Звязда», які на другі дзень запрасіў усіх на прэзентацыю рубрыкі «Клуб пчалаводаў» часопіса «Родная прырода». Была ўнікальная магчымасць блізка пазнаёміцца з лепшымі пчалярамі краіны, якія падзяліліся сваім спецыфічным «салодкім» майстэрствам. Уявіце, хіба можна было пры гэтым адказацца ад дэгустацыі смачнейшага пачастунку?! Ды толькі адным мёдам справа не абыйшлася. Жадаючыя прынялі ўдзел у бяспройгрышнай латарэі твораў мастака Вячаслава Паўлаўца, альбом якога «Акварэльны сусвет» прэзентавала «Звязда». На яе стэндзе чытачам запомнілася аўтограф-сесія з пісьменніцай Людмілай Рублеўскай, якая пазнаёміла са сваёй новай, пятай, кнігай серыі «Авантуры Пранціша Вырвіча» пад назвай «Авантуры Вырвіча з банды Чорнага Доктара». Падзеі ў рамане (за папярэдні аўтарка атрымала ў пазамінулым годзе Нацыянальную літаратурную прэмію ў намінацыі «Лепшы твор прозы») адбываюцца ў XVIII стагоддзі - у эпоху авантурыстаў і алхімікаў, рыцараў і чароўных дам, палацавых інтрыг і крывавых войнаў.

Выдавецкі дом «Беларусь сёгодня» падрыхтаваў экспазіцыю «У пошуках страчанага». Філакартычныя кнігі з рэпрадукцыямі старых паштовак былі часткай аднайменнага праекта «СБ» і лаўрэата прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава. На цэнтральным нацыянальным стэндзе вядомы не толькі ў нашай краіне калекцыянер прадставіў кнігі і фатаграфіі былых часоў, друкарскія і пісьмовыя прылады двух апошніх стагоддзяў, адноўлены па старажытных чарцяжах друкарскі станок XVI ст. і яго «дзіця» - копію Бібліі Скарыны. Сімвалічна, што менавіта на творчай сустрэчы публіцыстаў, пісьменнікаў і выдаўцоў, якая звязала наша багатае гістарычнае мінулае і памкненне сучаснікаў да захавання і ўзбагачэння культурнай спадчыны папярэднікаў, Уладзімір Ліхадзедаў перадаў у падарунак Нацыянальнай бібліятэцы існуючыя ў адзіным асобніку падшыўкі «Гродненских губернских ведомостей» за 1841 год і ўнікальныя рукапісныя дакументы XVII - XVIII стагоддзяў з калекцыі братоў Канстанціна і Яўстафа Тышкевічаў, якія ў 1842-м адчынілі ў Лагойску хатні прыватны музей - першы музей на Беларусі. Сярод іншых рэдкіх экспанатаў наведвальнікаў віталі арыгінал (!) «Малой падарожнай кніжкі» Францыска Скарыны 1522 года выдання і кніга «Беларускі буквар: чатыры стагоддзі гісторыі».

Не магла не звярнуць на сябе ўвагу на форуме і перасоўная выстаўка мастацкіх твораў пісьменнікаў краін - удзельніц СНД пад назвай «Чытаем разам - спазнаём адзін аднаго». Зладжаная Саветам па культурным супрацоўніцтве, Выканкамам Садружнасці і Прэзідэнтскай бібліятэкай Беларусі, яна дэманстравалася ўпершыню. Мелася магчымасць убачыць 56 кніг пісьменнікаў Азербайджана, Арменіі. Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана, Туркменістана і Расіі.

- Пры тым, што наша айчынная культура звязаная з вялікім рускім раманам XIX стагоддзя, - адзначыў спецпрадстаўнік Прэзідэнта Расіі па міжнародным і культурным супрацоўніцтве Міхаіл Швыдкой, - можна сказаць, што сёння ў нас працуе бліскучае сузор'е пісьменнікаў. Яны пішуць пра сённяшні час, пра боль і радасць, якія перажывае краіна. Для нас вялікі гонар прадстаўляць шматнацыянальную расійскую кніжную культуру, яе жывую літаратуру.

З боку расіян «Молодая гвардия» паказала насычаную праграму, у прыватнасці, навінкі вядомай серыі «Жыццё знакамітых людзей». З вуснаў Вячаслава Бандарэнкі, Максіма Макарычава і Мікалая Далгаполава прагучалі расповеды пра іх асабістую творчасць. Цікава, што сярод герояў кніжак апошняга з названых пісьменнікаў ёсць і беларусы. Гэта вядомая падпольшчыца, Герой Савецкага Саюза Надзея Траян, якая ўдзельнічала ў знішчэнні гаўляйтэра Вільгельма Кубэ, і былы савецкі выведнік у ЗША Міхаіл Мукасей.

Заўважным мерапрыемствам стаў і V міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час», які, па словах Аляксандра Карлюкевіча, з'явіўся пляцоўкай для ўмацавання добрасуседскіх адносін у гуманітарнай сферы, галінах культуры, літаратуры і мастацтва. Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, народны паэт Дагестана Магамед Ахмедаў, дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва імя Аўэзава ў Казахстане Кенжахан Матыжанаў, перакладчык са Славакіі Мар'ян Серватка, кіраўнік апарату Цэнтра перакладу пры Кабінеце Міністраў Азербайджана Яшар Аліеў, галоўны рэдакар «Литературной газеты» Максім Замшаў, у перакладзе якога на расійскім стэндзе гучалі вершы Янкі Купалы, ды іншыя казалі пра важнасць узаемаўзбагачэння краін, духоўнасць у літаратуры, адносіны з чыноўнікамі, выхаванне маладога пакалення, прапаганду сваёй літаратуры, крызіс чытання, дапамогу сучасных тэхналогій. Амерыканскі празаік і публіцыст Вікторыя Кінг прапанавала зрабіць апошнія зброяй літаратараў. Яна слушна заўважыла, што палова моладзі знаходзіцца сёння ў палоне інстагрампаэзіі. Вершы трэба дадаваць да пэўных візуальных вобразаў і такім чынам выходзіць на маладых людзей.

Дарэчы, у рамках сімпозіуму наладзілі шырокую прэзентацыю прысвечанага да 100-годдзя маладзёжнага руху ў Беларусі выдання «У рытме імклівых гадоў...». Крыху пазней падвялі вынікі 58-га нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі». Знак-сімвал «Вялікі залаты фаліянт» атрымаў складзены і падрыхтаваны цягам некалькіх дзесяцігоддзяў «Белкартаграфіяй» чатырохтомны «Вялікі гістарычны атлас Беларусі». Гэта першае ў нашай краіне арыгінальнае картаграфічнае выданне, прысвечанае яе гістарычнаму мінуламу. У спецыяльнай (адной з 14) намінацыі «У люстэрку часу» дыплом II ступені прысуджаны кнізе «Беларускі крымінальны вышук».

Застаецца шчыра парадавацца за тых, хто набыў «свае» выданні, якія зменяць іх асабісты светапогляд і само стаўленне да сябе ды акаляючага свету, а значыць, стануць больш, чым проста кнігамі на ўлюбёных паліцах. Сябруйце з крыніцамі ведаў, прыемнага ўсім чытання!

*Уладзімір БАРЫСЕНКА.*

## По страницам родной земли

**В Год малой родины издательство «Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки» при содействии Министерства информации порадовало читателей новыми достижениями своей печатной продукции, презентация которых состоялась в рамках XXVI Минской международной выставки-ярмарки в Национальном художественном музее.**

**«Я ходил по родной белорусской земле. Я был счастлив…» - сердечное признание знаменитого мастера - народного художника БССР и РСФСР Витольда Бялыницкого-Бирули украсило обложку альбома его потрясающих работ.**

**Он родился в усадьбе Крынки около Белыничей, что на Могилевщине, затем долгое время жил и работал в России. Творческое наследие автора велико - около двух тысяч произведений, многие из которых находятся в музеях мира и частных коллекциях. Самая значительная часть - 460 картин и этюдов - хранится в Национальном художественном музее Беларуси и по праву считается его гордостью.**

**Это новое, еще приятно пахнущее типографской краской, издание посвящено живописцу, отмеченному Богом высоким талантом и пронесшему через всю жизнь трепетную любовь к малой родине. Через воспоминания и картины В. Бялыницкого-Бирули, лирические зарисовки белорусских и русских поэтов раскрывается внутренний мир мастера, то высокое чувство к своим корням, которое питает каждого из нас.**




Фото из Интернета.

**Иллюстрированная энциклопедия «Музеи Беларуси» поможет читателю совершить экскурсию по почти 200 музеям нашей страны и их филиалам, расскажет об истории создания учреждений культуры, фондах и выставках, бесценных артефактах - свидетельствах разных эпох, сохранившихся до наших дней. Фото увлекательнейших экспозиций, представленные на страницах печатного издания, не только дадут возможность изучить редкие находки археологов или шедевры высокого искусства, но и позволят окунуться в атмосферу прошлого родного края, чтобы достойно продолжить традиции своих предков.**

**Обе книги изданы на русском, белорусском и английском языках.**

*Ирина ЛЮБЯНСКАЯ.*